**Зайцава, Л.** «Афганістан гарыць у маёй душы» / Л. Зайцава // Герой працы. – 2017. – 17 лют. – С. 2.

# «АФГАНІСТАН ГАРЫЦЬ У МАЁЙ ДУШЫ»

*Напярэдадні 100-годдзя з дня ўтварэння беларускай міліцыі ў падраздзяленнях РАУС праходзяць сустрэчы з ветэранамі органаў унутраных спраў. Так, у Шумілінскае аддзяленне Дэпартамента аховы МУС завітаў былы камандзір аддзялення спецыяльнага падраздзялення пазаведамаснай аховы Мікалай Аляксандравіч Калянковіч. Сустрэча ладзілася напярэдадні 15 лютага, калі Беларусь адзначае Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, бо Мікалай Калянковіч – былы «афганец».*

Калі ветэрана папрасілі падзяліцца ўспамінамі, ён адказаў словамі з назвы кнігі пра афганцаў: «Афганістан гарыць у маёй душы». Мікалай Аляксандравіч расказаў, што ў 1979 годзе ён знаходзіўся на тэрміновай ваеннай слўжбе ў войсках сувязі Маскоўскай ваеннай акругі, быў намеснікам камандзіра ўзвода. У студзені 1980-га, калі заставалася служыць ўсяго паўгода, полк паднялі па трывозе. Камандзір аб’явіў, што адпраўляюць для аказання дапамогі ў Рэспубліку Афганістан. Па жаданні кожны мог застацца даслужваць у Саюзе, але ж Мікалай Калянковіч быў салдат, абаронца, які не мог адступіцца ад свайго сумлення. Ён добра ведаў, што едзе на вайну.

Мікалай Аляксандравіч згадаў, як з сябрамі дзяліўся апошнім глытком вады, успомніў выпадкі, калі душманы рабілі напады на савецкія войскі, як сэрца сціскалася ад гора і крыўды, калі салдаты гінулі пад кулямі...

***Ларыса ЗАЙЦАВА***